Дзяржаўная ўстанова культуры
“Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“
Германавіцкая сельская бібліятэка-філіял

# ПРОЙДЗЕНЫ ШЛЯХ ВОІНА - ЗЕМЛЯКА




Падрыхтавала:
Хоміч Тацццяна
Геннадзьеўна, бібліятэкар

**Германавічы, 2024**




Хрол Віктар Іосіфавіч нарадзіўся 8 лістапада 1918 года ў вёсцы Васількова Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і, у якой выхоўвалася трое хлопцаў. Віктар быў сярэднім сынам. Змалку дапамагаў бацькам па гаспадарцы, а таксама дапамагаў бацьку ў сталярскай справе. Закончыў хлопец 5 класаў сямігодкі ў вёсцы Германавічы.

У 1939 годзе, калі вызвалілі Заходнюю Беларусь ад Польшчы, у сям'і Хралоў была радасць і надзея на тое, што гэта збаўленне ад нястачы, знявагі, гора. Хутка Віктара прызвалі на вайсковую службу. Калі адыходзіў з дому, бацька гаварыў, каб служыў чэсна, слухаўся камандзіраў, не забываў родны дом. Віктар Іосіфавіч супакойваў бацькоў, што гады службы праляцяць як адно імгненне. Не ведаў сын, што надоўга развітваецца з родным домам, што не ўбачыць ў жывых бацькоў.

Праз год пачалася вайна.

Разам са сваім палком адступаў і камандзір аддзялення малодшы сяржант Хрол Віктар Іосіфавіч. Пасля цяжкіх баёў пад Чаркасамі, Белацарквой пакінулі Украіну. Ад стомы, несупынных баёў, пераходаў нылі спіна, рукі. Але фізічныя пакуты былі нішто ў параўнанні з тым, што бачылі навокал. Стагнала зямля, лілася кроў, вакол папялішчы, забітыя, пакалечаныя людзі.

Немцы рваліся да Масквы. Віктар Іосіфавіч удзельнічаў у баях пад Мажайскам, Валакаламскам. У снежні 1941 яго адазвалі з фронту і накіравалі на Урал, на адзін з ваенных заводаў. Практычна не было там ніякага прадпрыемства. Пад адкрытым небам стаялі станкі, абсталяванне. Гэта ўжо потым над галавой з'явіўся нейкі дах.

Людзі працавалі і ў снег, і ў дождж. Ніхто не скардзіўся. Разумелі, што на фронце цяжэй. Два гады разам з людзьмі, якія сталі блізкімі і дарагімі, працаваў Віктар Іосіфавіч.

У жніўні 1943 года Храла В. І. зноў накіравалі ў дзеючую армію пад Невель. Віктар Іосіфавіч успамінаў: "Дадому было рукой падаць. Хацелася пабачыць родных, блізкіх, але Шаркаўшчына была яшчэ акупіравана. Пазней ў газеце прачытаў, што вызвалена мястэчка Германавічы і яго ваколіцы. Уздыхнуў, беражліва згарнуў газетны лісток, паклаў у кішэню, маўляў, да хуткай сустрэчы, родная зямля ".

Шлях Віктара Іосіфавіча ляжаў далей праз Вялікія Лукі і Прыбалтыку. З баямі рухаліся да граніцы з Польшчай. Былі баі за Гданьск і Варшаву.

А потым апошняя, самая цяжкая бітва за Берлін. Віктар Іосіфавіч успамінаў: ”Тры дні не сціхалі баі на вуліцах. Даводзілася змагацца за кожны квартал, кожны дом, прыступку. Усё было замініравана, з усіх бакоў падсцерагала небяспека. Крыўдна было падумаць, што можна загінуць ў канцы вайны. Вельмі хацелася жыць, каб расказаць нашчадкам праўду пра вайну, пра цяжкасці і неймаверныя пакуты, пра высакароднасць савецкага салдата. “



Віктар Іосіфавіч быў сур’ёзна паранены ў нагу і руку. Нага напамінала аб сабе пастаянна. А два пальцы на руцэ засталіся нерухомымі. Але Віктар Іосіфавіч казаў, што яму вельмі пашанцавала: удалося выратаваць і нагу, і руку.

Потым быў парад. Парад пераможцаў. І ў страі разам з усімі крочыў Віктар Іосіфавіч Хрол.

Віктар Іосіфавіч узнагароджаны медалём “За адвагу”, ”За Варшаву “, “За ўзяцце Берліна”, “За перамогу над Германіяй”, ордэнам Айчыннай вайны II ступені.





Віктар Іосіфовіч успамінаў: “Нельга выразіць словамі радасці і шчасця, калі я вяртаўся дадому. Я марыў аб гэтым доўгіх шэсць год Але бацькі мяне ўжо не сустрэлі. Іх ужо не было ў жывых. Трэба было ўліваццца ў мірнае жыццё“.

Хутка Віктар сустрэў сваё каханне—Хрол Веру. Згулялі вяселле. Жылі ў вёсцы Цярэшкі ў хаце жонкі. У сям’і нарадзілася тры дачкі: Ганна, Марыя, Ірына. Усё было як ў людзей.





У Віктара Іосіфавіча былі залатыя рукі, майстра быў адменны. Сталярскай справе яго навучыў яшчэ да вайны бацька. Яго рукамі пабудавана некалькі хат у вёсцы Германавічы і ў акрузе.

Сам майстраваў мэблю і розныя рэчы па гаспадарцы. Быў вельмі адказным і актыўным чалавекам. Калі кінулі кліч на асваенне цалінных зямель у 60-я гады, Віктар Іосіфавіч быў у першых радах. Так ён са сваёй сям'ёй аказаўся ў Казахстане. Спачатку было вельмі цяжка, але з цягам часу жыццё наладзілася: атрымалі жыллё ( хату на дзве сям'і), развялі гаспадарку. На цаліну з'язджаліся людзі з розных краін, але знаходзілі агульную мову, дапамагалі адзін аднаму. Як бы там не было, а на радзіму цягнула. І ў 1971 годзе сям'я Віктара Іосіфавіча вяртаецца ў Беларусію. Уладкаваўся працаваць у Шаркаўшчынскі ПМК-51, меў шэраг узнагарод за старанную працу.

Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, Віктар Іосіфавіч вёў актыўны вобраз жыцця. Любіў сталярнічаць, рыбачыць, хадзіць у лес. А яшчэ вельмі любіў спяваць. І гэта ў яго добра атрымоўвалася, асабліва пад балалайку, на якой ён цудоўна іграў. Гучалі мелодыі і на губным гармоніку ( губны гармонік захоўваўся ў сям'і яшчэ з вайны доўгія гады ). Асабліва кранаді песні пра вайну. Ледзь бачна праступалі слёзы на вачах ветэрана, калі гучалі песні ваенных гадоў.

Ніколі не адмаўляўся ад сустрэч з падрастаючым пакаленнем. Часта расказваў пра вайну і сваім дочкам. З успамінаў яго дачкі Ірыны: " У памяці ўсплывае зімовы вечар, калі мы з бацькам сядзім каля распаленага вогнішча ў печы, глядзім на полымя і вядзём размову пра той страшэнны час. Мне падабалася слухаць расказы бацькі. Тады яшчэ ўсяго не разумела, а разуменне

прыйшло з гадамі. Я пыталася ў таты, ці страшна было на вайне? Бацька казаў: ”Канешне, страшна. Вельмі страшна. Але мацней за страх было жаданне перамагчы, вызваліць сваю Радзіму, вызваліць родных і дарагіх людзей ад ворага. І велізарнае жаданне жыць, вярнуцца дадому “. Яшчэ бацька казаў, што яму давялося шэсць разоў хадзіць у атаку. Было вельмі страшна. Прыходзілася глядзець ворагу ў вочу. Трэба было дзейнічаць хутка і рашуча. Ты або цябе— такое жыццё “.

Памяць аб ваенным ліхалецці павінна жыць у стагоддзях. Мы, нашчадкі, павінны ведаць падзеі мінулай вайны, вывучаць гісторыю сваёй маленькай радзімы, бо той народ, які не ведае і не шануе мінулага , не мае будучыні.

Апошнія гады жыцця ветэран вайны шмат хварэў. Перанёс некалькі аперацый, але ніколі не падаў духам. Сябраваў з унукамі, якія яго памятаюць і сёння.

На 77 годзе жыцця Віктара Іосіфавіча не стала. Памёр Віктар Іосіфавіч у красавіку 1995 года. Пахаваны на могілках у вёсцы Германавічы.

